МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

пр. Пераможцаў, 11; 220004, г.Мінск
тэл. (017) 203 75 74, факс (017) 203 90 45
БІК: AKBB BY 2Х; рахунак:
BY71AKBB36049000026690000000
ААТ «АСБ Беларусбанк»
e-mail: ministerstvo@kultura.by

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

пр. Победителей, 11; 220004, г.Минск
тел. (017) 203 75 74, факс (017) 203 90 45
БИК: AKBB BY 2Х; счет:
BY71AKBB36049000026690000000
ОАО «АСБ Беларусбанк»
e-mail: ministerstvo@kultura.by

26.12.2019 № 01-16/Кл-553
На № ад

(для інфармавання зацікаўленых)

Аб разглядзе калектыўнага
звароту грамадзян

Міністэрства культуры разгледзела ў межах сваёй кампетэнцыі калектыўны электронны зварот грамадзян адносна захавання будынка раённага краязнаўчага музея ў г. Чэрвень, які паступіў з пракуратуры Мінскай вобласці, і з улікам раней разгледжаных лістоў грамадзян па адзначаных пытаннях паведамляе наступнае.

Будынак па адрасе: г. Чэрвень, плошча Свабоды, 8 не ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

У адпаведнасці з артыкулам 41 Закона Рэспублікі Беларусь “О местном управлении и самоуправлении в Республике Беларусь” да кампетэнцыі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў адносіцца правядзенне мерапрыемстваў па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і ажыццяўленне кантролю ў гэтай сферы, а таксама вырашэнне пытанняў размяшчэння аб'ектаў будаўніцтва на адпаведнай тэрыторыі і забеспячэнне распрацоўкі горадабудаўнічых праектаў.

Згодна з падпунктам 1.6 пункта 1 артыкула 14 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры (далей – Кодэкс) мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ў сферы культуры арганізуюць і садзейнічаюць правядзенню мерапрыемстваў па ахове гісторыка-культурнай і археалагічнай спадчыны.

Пунктам 1 артыкула 93 Кодэкса ўстаноўлена, што наданне культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці

ажыццяўляецца мясцовым выканаўчым і распарадчым органам абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню – у адносінах да матэрыяльнай культурнай каштоўнасці, якая мае значнасць для асобнага рэгіёна, на тэрыторыі якога яна знаходзіцца.

У адпаведнасці з артыкулам 96 Кодэкса гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія маюць значнасць для асобнага рэгіёна Рэспублікі Беларусь адносяцца да катэгорыі "3".

Падрабязны алгарытм дзеянняў па наданні матэрыяльным культурным каштоўнасцям статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі "3" размешчаны на інтэрнэт-сайце Міністэрства культуры па спасылцы http://www.kultura.by/by/pyt_adk/.

Згодна з пунктам 2 артыкула 90 Кодэкса прапановы аб наданні матэрыяльным культурным каштоўнасцям статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці ўносяцца ў пісьмовай форме ў мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню.

У адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 91 Кодэкса фіксацыю, навуковую апрацоўку і мастацкую ацэнку культурных каштоўнасцей, забяспечваюць мясцовы выканаўчы і распарадчы орган абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню, іншая юрыдычная асоба, грамадзянін, у тым ліку індывідуальны прадпрымальнік, **якія ўносяць прапанову аб наданні культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.**

Міністэрства культуры лістамі ад 11.06.2019 № 04-16/Т-278 і ад 10.07.2019 № 04-09/3484 звярталася ў Мінскі аблвыканкам і Чэрвеньскі райвыканкам аб разглядзе пытання неабходнасці прыняцця мер па захаванні гістарычных будынкаў г. Чэрвеня, у тым ліку адзначанага будынку музея, а таксама прапрацаваць ва ўстаноўленым парадку пытанне аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці пазначаным у звароце будынку ў адпаведнасці з артыкулам 91 Кодэкса з папярэднім разглядам прапаноў на Мінскім абласным савеце па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны (копіі лістоў дадаюцца).

Дадаткова адзначаем, што ў адпаведнасці з Палажэннем аб парадку правядзення грамадскіх абмеркаванняў у галіне архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 01.06.2011 № 687, грамадскія абмеркаванні горадабудаўнічых праектаў праводзяцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі.

Пытанні аб правядзенні грамадскіх абмеркаванняў дадзенага праекта, а таксама ажыццяўленне дзяржаўнага кантролю за эфектыўным і рацыянальным выкарыстаннем бюджэтных сродкаў і дзяржаўнай уласнасці не ўваходзяць у кампетэнцыю Міністэрства культуры.

Такім чынам, Міністэрства культуры прыняла вычарпальныя меры ў межах сваёй кампетэнцыі.

Дадзены адказ на зварот можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым часткай першай пункта 1 артыкула 20 Закона Рэспублікі Беларусь «Об обращениях граждан и юридических лиц».

Першы намеснік Міністра Н.У. Карчэўская

Бейлін 203 46 21